**Г.К. Семянькова** (Віцебск)

# ДРУГАСНЫЯ ПРОЗВІШЧЫ НА ТЭРЫТОРЫІ ВІЦЕБШЧЫНЫ: АСАБЛІВАСЦІ ЛІНГВАГЕАГРАФІІ

Мэта артыкула – паказаць асаблівасці размяшчэння другасных прозвішчаў на тэрыторыі Віцебскай вобласці, выявіць фактары, якія аказваюць уплыў на прадуктыўнасць розных прозвішчных тыпаў. Матэрыялам паслужылі сучасныя прозвішчы, сабраныя падчас лінгвістычных экспедыцый, а таксама працы з архіўнымі дадзенымі.

На тэрыторыі Віцебшчыны другасных прозвішчаў бытуе значна больш, чым першасных: адпаведна 70% і 30%. Кожны прозвішчны тып вылучаецца сваімі асаблівасцямі размяшчэння і бытавання. Спынімся на апісанні лінгвагеаграфіі кожнага з выяўленых тыпаў больш падрабязна.

Прозвішчы на *-оў/-еў/-аў* на тэрыторыі Віцебшчыны размешчаны нераўнамерна: на паўднёвым захадзе іх частотнасць нязначна перавышае дзесяціпрацэнтны паказчык, а на ўсходзе складае больш за 60%. Максімальная канцэнтрацыя выяўляецца ў Гарадоцкім, Сенненскім, Віцебскім, Чашніцкім, Талачынскім, Аршанскім і Дубровенскім раёнах (частотнасць большая за 60%). У раёнах, якія прылягаюць да пералічаных, такія антрапонімы складаюць ад 40% да 60%: Полацкі – амаль 43%, Лёзненскі – 47%, Шумілінскі – амаль 53%. Прычына такой высокай частотнасці прозвішчаў на ўсходзе вобласці бачыцца нам у гістарычных асаблівасцях фарміравання антрапанімікону гэтай тэрыторыі: у 1772 г. некаторыя землі сучаснай усходняй Віцебшчыны былі далучаны да Расіі, пасля чаго іх насельніцтва стала афармляцца прозвішчамі на *-оў/-еў/-аў*. Дарэчы, і зараз жыхары прылеглых да Расіі тэрыторый імкнуцца дасягнуць "рускага" гучання свайго прозвішча, далучыўшы да яго фармант *-оў/-еў/-аў* і замацаваўшы такія змены ў афіцыйных дакументах.

На астатняй тэрыторыі назіраецца зніжэнне ўдзельнай вагі прозвішчаў на *-оў/-еў/-аў* у накірунку з усходу на захад і на паўднёвы захад: у Верхнядзвінскім і Мёрскім раёнах такім антрапонімам належыць 21% ад усіх адзінак, ва Ушацкім – 19%, у Пастаўскім – 14%. У Глыбоцкім і Докшыцкім раёнах назіраецца найменшая частотнасць адзінак (12%).

Таксама нераўнамерна размешчаны прозвішчы на *-ін/-ын*. Самы высокі паказчык прадуктыўнасці не перавышае 13%. Часцей, чым у іншых, антрапонімы на *-ін/-ын* сустракаюцца ў Віцебскім, Лёзненскім і паўночнай частцы Аршанскага раёнаў, у якіх удзельная вага адзінак на *-ін/-ын* блізкая да 12%. З рухам на захад, а таксама на поўнач і поўдзень ад названай тэрыторыі колькасць такіх прозвішчаў прыкметна змяншаецца: у раёне Полацка іх канцэнтрацыя не перавышае 8%, Шуміліна – крыху большая за 7%, Суража і Чашнікаў – крыху большая за 5%; на захадзе Віцебскай вобласці доля антрапонімаў на *-ін/-ын* блізкая да 1%.

Лічыцца, што ў Беларусі змяншэнне частотнасці прозвішчаў на *-оў/-еў/-аў* і на *-ін/-ын* адбываецца ў накірунку з усходу на захад [1, с. 41–43]. Не адмаўляючы сказанага, а ўдакладняючы яго адносна Віцебшчыны, звернем увагу на тое, што хваля зніжэння прадуктыўнасці названых адзінак рухаецца па вобласці не строга з усходу на захад, а па дузе – з усходу на поўнач і паўночны захад, а потым – у паўднёва-заходнюю частку. Мяркуем, што тлумачэнне такой з'явы трэба шукаць у геаграфічным становішчы Віцебшчыны, якая на ўсходзе мяжуе з Расіяй, таму яе антрапанімныя традыцыі аказваюць уплыў на склад прозвішчаў усходніх тэрыторый Віцебшчыны; на поўначы такое ўздзеянне крыху паслабляецца: тут пачынаюць дзейнічаць не толькі рускія, а і прыбалтыйскія моўныя і анамастычныя законы. Моцны адбітак антрапанімных традыцый прыбалтыйскіх рэспублік адчуваецца на паўночным захадзе Віцебшчы-

Рэпазіторый ВДУ

ны. Цэнтральная ж і паўднёва-заходняя часткі вобласці пазбаўлены такога ўплыву, таму паказчыкі частотнасці прозвішчаў на *-оў/-еў/-аў* і на *-ін/-ын* тут ніжэйшыя, чым на ўсходзе і поўначы, і вышэйшыя, чым на захадзе.

Прозвішчы на *-скі/-цкі,* якія на Віцебшчыне займаюць другое месца па частотнасці, размешчаны не менш кантрасна. Акрамя агульнавядомай тэндэнцыі зніжэння прадуктыўнасці іх у накірунку з захаду на ўсход, звяртае на сябе ўвагу існаванне спецыфічнага масіву (Глыбоцкі, Шаркоўшчынскі раёны), у якім удзельная вага прозвішчаў на *-скі/-цкі* самая высокая на Віцебшчыне (каля 22%). Пры аддаленні ад названага масіву прадуктыўнасць паступова зніжаецца і складае менш за 20%.

Прычына такой высокай долі прозвішчаў на *-скі/-цкі* ў заходнім рэгіёне найперш у існуючых тут традыцыях называць чалавека па месцы яго жыхарства або нараджэння. Дарэчы, нідзе так часта, як на захадзе Віцебшчыны, не сустракаюцца выпадкі, калі прозвішча ўтворана ад назвы населенага пункта [2]. Адзначаны нават факты, калі жыхары вёскі носяць адно прозвішча, якое паходзіць ад назвы гэтай вёскі: у вёсцы Каліты Пастаўскага раёна 17 жыхароў з 30 маюць прозвішча *Каліцкі*. Распаўсюджана і адваротная з'ява: на тэрыторыі Глыбоцкага раёна існуе каля 20 населеных пунктаў, назвы якіх утварыліся ад антрапонімаў. Характэрна, што ў большасці такіх вёсак і зараз жывуць карэнныя жыхары з прозвішчамі, якія далі назву вёсцы: прозвішча *Кухта* – вёска Кухты, прозвішча *Шубнік* – вёска Шубнікі, а таксама *Тумаш* – Тумашы, *Раманчук* – Раманчукі і інш.

Самая нізкая прадуктыўнасць адзінак на *-скі/-цкі* назіраецца на Гарадоччыне, усходняй частцы Шуміліншчыны, а таксама паўднёвай і заходняй частках Віцебскага раёна (менш за 5%), што можа быць растлумачана адсутнасцю такіх глыбокіх традыцый называння чалавека па месцы жыхарства або нараджэння, як на захадзе.

Прозвішчны тып на *-овіч/-евіч/-авіч, -іч/-ыч/-ыц* займае на тэрыторыі Віцебшчыны трэцяе месца (9%). Заўважаецца тэндэнцыя зніжэння частотнасці такіх адзінак у накірунку з захаду на ўсход. Вылучаюцца два масівы максімальнай прадуктыўнасці: першы прыкладна супадае з тэрыторыяй Браслаўскага раёна, а другі ахоплівае амаль увесь Докшыцкі, паўднёва-ўсходнюю частку Пастаўскага і паўднёва-заходнюю частку Лепельскага раёнаў. Удзельная вага антрапонімаў названага тыпу складае ў другім масіве ад 20% (на Браслаўшчыне) да 28% (на паўднёвым усходзе Пастаўшчыны), але нідзе не перавышае трыццаціпрацэнтны паказчык. Супастаўляючы прыведзеныя назіранні з дадзенымі М.В. Бірылы [1, с. 36], заўважаем, што другая зона – гэта працяг вялікага ядра з прадуктыўнасцю большай за 50%, размешчанага на паўночнай ускраіне Мінскай вобласці ў зоне Вілейка – Крывічы – Бягомль.

Самая нізкая частотнасць прозвішчаў названага тыпу назіраецца на ўсходзе Віцебскай вобласці. Прычына, відаць, у блізкасці, а раней агульнасці гэтых зямель з рускімі тэрыторыямі, на якіх працэнт такіх адзінак невысокі, бо ў XVI – XVIII стст. маскоўскія князі, а пасля і цар надавалі саслоўнае адценне імёнам па бацьку на *-ович*, абмяжоўваючы іх ужыванне і дазваляючы карыстацца толькі выбраным асобам [1, с. 37].

Сярэдні паказчык прадуктыўнасці прозвішчаў на *-енка/-энка/-анка* па Віцебшчыне – 7%. Найбольшая іх колькасць адзначаецца вакол Віцебска. Усходняя мяжа гэтай зоны знаходзіцца прыблізна на лініі Полацк – Ула – Орша. Масіў самай высокай канцэнтрацыі ахоплівае каля 1/3 усёй вобласці. Прадуктыўнасць гэтага тыпу неаднолькавая на розных тэрыторыях акрэсленай зоны: на Сенненшчыне і вакол г.п. Ула – толькі крыху большая за 10%, на Лёзненшчыне – амаль 15%, у раёне Шуміліна і Полацка – амаль 12%, а на прылеглых да Суража землях – больш за 16%. Па-за межамі акрэсленай зоны фіксуецца рэзкае зніжэнне ўдзельнай вагі названых прозвішчаў: на захадзе і поўначы ад Полацкага раёна такіх антрапонімаў налічваецца ад 4% да 6%, на захадзе ад Аршанскага раёна – каля 4%.

Репозиторий ВГУ

Самая нізкая частотнасць уласціва захаду Віцебшчыны (Браслаўскі, паўднёва-заходняя і паўночна-заходняя часткі Мёрскага раёнаў).

Адзінкі на *-ёнак/-онак* уласцівы толькі беларускай антрапанімнай сістэме. У сярэднім па рэспубліцы яны складаюць 1,26%, на Віцебшчыне ж – 4,5%. Своеасаблівае ядро такіх прозвішчаў знаходзіцца на захадзе ад цэнтра вобласці: на Ушаччыне іх прадуктыўнасць роўная амаль 9%, на Глыбоччыне – амаль7%, у раёне Асвеі і Верхнядзвінска – адпаведна 8% і 6%. Самай жа высокай частотнасцю вылучаецца Мёрскі раён – 10%. На ўсіх накірунках ад акрэсленага цэнтра назіраецца паступовае змяншэнне колькасці прозвішчаў на *-ёнак/-онак*. Ва ўсходняй частцы Віцебшчыны ўдзельная вага такіх онімаў не перавышае 1%.

Прозвішчам на *-ук/-юк* уласціва невысокая прадуктыўнасць – крыху большая за 1%. Тэрыторыя найбольшай частотнасці ахоплівае паўднёвую і паўднёва-заходнюю часткі Віцебшчыны, а таксама Верхнядзвінскі, Мёрскі і Ушацкі раёны. Пры аддаленні ад гэтай зоны адбываецца паступовае зніжэнне прадуктыўнасці прозвішчаў: на паўночным захадзе, на поўначы і ў цэнтральнай частцы вобласці іх удзельная вага складае ў сярэднім 0,6%. Самай нізкай частотнасцю вызначаецца ўсходняя частка Віцебшчыны: на Лёзненшчыне – 0,3%, Дубровеншчыне – 0,4%.

Прозвішчны тып на *-ец/-эц* з’яўляецца на Віцебшчыне непрадуктыўным (каля 0,8%). Аднак у некаторых рэгіёнах частотнасць такіх адзінак бывае значна вышэйшая за сярэдні паказчык па вобласці. Зоны найбольшай частотнасці прыкладна супадаюць з тэрыторыяй, на якой адзначаецца шырокае распаўсюджанне антрапонімаў на *-скі /-цкі.* Гэта не выпадкова, таму што прозвішчы абодвух тыпаў у перыяд іх узнікнення выконвалі аднолькавую функцыю – указвалі на месца нараджэння, паходжання або пражывання іх носьбіта.

Сярэдні паказчык прадуктыўнасці прозвішчаў з фармантам *-ік/-ык, -чык* на Віцебшчыне складае 0,7%. На паўднёвым захадзе частотнасць такіх адзінак парой у два і больш разы перавышае прыведзеную лічбу: у Глыбоцкім раёне – 1,9%, ва Ушацкім – 1,2%, у Докшыцкім – 2%. Зніжэнне колькасці прозвішчаў на *-ік/-ык, -чык* назіраецца ў накірунку з захаду на ўсход і на поўнач.

Што да адзінак прозвішчных тыпаў на *-ак/-як*, на *-еня/-эня* і на *-іх/-ых,* то колькасць такіх антрапонімаў не перавышае дзесятка ў кожным з названых тыпаў і складае менш за 1%.

Такім чынам, другасныя прозвішчы распаўсюджаны на тэрыторыі Віцебшчыны нераўнамерна. Асноўныя фактары, што аказваюць уплыў на іх прадуктыўнасць, наступныя: 1) гістарычныя асаблівасці фарміравання тэрыторыі сучаснай Віцебшчыны; 2) геаграфічнае становішча вобласці, якая на ўсходзе і паўночным усходзе мяжуе з Расіяй, таму ў гэтых раёнах павялічваецца ўплыў рускіх антрапанімных традыцый; паўночна-заходняя ж і заходняя часткі адчуваюць уздзеянне прыбалтыйскіх рэспублік; 3) існуючыя на пэўных тэрыторыях моўныя, дыялектныя, антрапанімныя традыцыі.

**Літаратура**

1. Бірыла, М.В. Тыпалогія і геаграфія славянскіх прозвішчаў. Даклады Х Міжнароднага з’езда славістаў / М.В. Бірыла. – Мінск: Навука і тэхніка, 1988. – 63 с.

2. Семянькова, Г.К. Аб’ём і змест аднаго з мікраядзер семантычнага поля “Прозвішчы жыхароў Віцебшчыны” / Г.К. Семянькова // Весці Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта, 2001. – № 2. – С. 56 – 63.



Репозиторий ВГУ